Бохан Л.В., студ. гр. 401ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,
ст. выкладчык

# ДАСЛЕДАВАННІ СЛАВЯНСКАЙ МІФАЛОГІІ: ЗНАЧЭННЕ НАВУКОВАЙ СПАДЧЫНЫ А. КІРКОРА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распачатае ў 1970-я гг. даследаванне і выкарыстанне фальклорных тэкстаў, апублікаваных у XIX ст., зрабіла іх найкаштоўнейшай крыніцай тамоў БНТ: «Зімовыя песні: Калядкі і шчадроўкі» (1975), «Веснавыя песні» (1979), «Валачобныя песні» (1980), «Купальскія і пятроўскія песні» (1985), «Балады» (Кн. 1—2. 1977—1978), над якімі працавалі А. Фядосік, А. Ліс, К. Кабашнікаў, Г. Барташэвіч, А. Гурскі, Л. Салавей. Сёння здабыткі міфолагаў П. Шпілеўскага, А. Кіркора, П. Шэйна, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага, Я. Ляцкага, М. Доўнар-Запольскага, А. Багдановіча ўвайшлі у акадэмічныя выданні па беларускаму фальклору і міфалогіі і развіваюцца сучаснымі беларускімі даследчыкамі, міфолагамі і фалькларыстамі: Т. Шамякінай, А. Ненадаўцом, І. Казаковай, В. Новак, У. Васілевічам, І. Швед, Т. Валодзінай.

Знаўца гісторыі і этнаграфіі Беларусі і Літвы, А. Кіркор падрыхтаваў паводле праграмы Рускага геаграфічнага таварыства працу “Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню” (1857-59). У ёй выказана глыбокая павага аўтара да духоўнай спадчыны народа, прыведзена значная колькасць беларускіх народных песень.

Для характарыстыкі міфалагічных поглядаў даследчыка будзе істотным тэзіс аб уплыве на яго “салярнай” і “метэаралагічнай тэорыі” нямецкіх міфолагаў М. Мюлера і А. Куна. Уплыў “салярнай” тэорыі выражаны найперш у тым, што найбольшы міфалагічна-абрадавы сэнс надаецца пераходным кропкам календара: зімовы  сонцаварот / барацьба дабра і зла, святла і цемры, увасобленая ў змаганні *Перуна* з *Сыціўратам / Карачуном* [4: 252]. У навуковых

тэкстах А. Кіркора няма прамых спасылак на даследаванні нямецкіх міфолагаў, аднак на гэта ўказваюць цэлы шэраг кіркораўскіх тэзісаў: маланка / *Грамаўніца*, *Цёця*, жонка *Перуна*; сіла холаду і зімы / воўк; мяцеліцы / ваўчыныя зграі; матыў "паварочвання сонца" / паварочванне мядзведзя ў бярлогу; арыйская ахвяра богу-Сонцу / дзік, свіння [4: 251-252].

Наогул прынцып супастаўлення антычных і германскіх / славянскіх багоў упершыню быў зафіксаваны яшчэ ў сярэдневечных заходніх хроніках. Ён рэалізаваны, як ужо адзначалася, у Mater Verborum, у хроніцы Адама Брэменскага. Падобныя інтэрпрэтацыі з'явіліся асноўным тэарэтыка-метадалагічным прынцыпам міфолагаў. Напрыклад, семантычна-функцыянальнае поле *Сыціўрата* (*Sytiwrat*), паводле А. Кіркора, атаясамлівае яго з грэчаскім *Кронасам,* як персаніфікацыяй ідэі часу [4: 252]. Славянскі корань 'врат', відавочна, абумоўлівае рэмінісцэнцыі з вобразам 'павяртання сонечнага кола", што семантычна апраўдвае знаходжанне *Сыціўрата* ў калядным цыкле. Беларускае свята Грамніцы, нагадвае А. Кіркору "язычніцкае ачышчэнне агнём (Februa)" і параўноўваецца ім са старажытнарымскімі рытуаламі ў гонар багіні жывёлагадоўлі Pales, што ўключалі такія рытуальныя дзеянні як спаленне, ахвярапрынашэнне агню, скокі праз агонь. *Масленіца* – "тыя ж Сатурналіі і Вакханаліі ў Беларусі" [4: 256]. *Лешы* (укр. *Полісун, Лісовік*) – казла624ногі *Пан*, ваўчыны пастыр [4: 271]. "*Пярун,* - піша А. Кіркор, - магутны цар нябесны, якому *Белабог* даручыў нябесны молат, каб весці адвечную барацьбу з *Чарнабогам* і яго бясоўскім войскам, жыве ў памяці ўсіх славянаў і літоўцаў. Ён цалкам адпавядае *Індры* індыйцаў, *Зеўсу* грэкаў, *Тору* германцаў" [4: 267]. Тэонім *Белабог* сустракаецца ў славянскай фразеалогіі і фальклоры. Падставай рэканструкцыі *Белабога* міфолагамі-папярэднікамі А. Кіркора, найперш - А. Афанасьевым, з'яўляюцца ўскосныя дадзеныя "Славянскай хронікі" Гельмгольда. Шэраг вучоных, у прыватнасці Н. Талстой, указваючы на тое, што ў "Хроніцы" названы толькі "нейкі добры бог, што супроцьстаіць

*Чарнабогу*", лічаць міфалагічны вобраз *Белабог*а вымышленым, узніклым пад уплывам літаратурных рэмінісцэнцый ці познім запазычаннем з нямецкай міфалогіі [5: 1: 151]. Пастуліраванне апазіцыі *Белабога* / *Чарнабога* як дуалістычнага ўяўлення аб свеце з'яўялецца, на думку В. Топарава, з’яўляецца маладаставерным. Гэтыя славянскія боствы ўзгадваюцца ў літаратуры класіцызму 18-19 ст., якая з’яўляецца крыніцай другаснай: М. Хераскаў увёў названых *Белабога* / *Чарнабога* і шэраг іншых славянскіх бостваў у паэме "Уладзімір адроджаны" (1785), Н. Карамзін - у "Гісторыі дзяржавы Расійскай". Неабходна адзначыць, што А. Кіркор адзначае: “Пра *Чарнабога* мы не сустрэлі нідзе прамых указанняў. Здаецца, што *Зюзя* цалкам заступіў яго месца. Здаецца, адны паморцы яўна пакланяліся *Чарнабогу*; не менш за іх славяне баяліся *Чарнабога* і таемна прыносілі яму ахвяры. З пашырэннем хрысціянскіх паняццяў *Чарнабог* канчаткова змяніўся на чорта, а ў Беларусі, як ва ўсіх славянаў, захавалася прыказка: “І Бога хвалі, і чорта не гняві” [4: 273].

А. Кіркор даследаваў славянскую міфалогію не толькі на фактах празаічных фальклорных жанраў, але ўключыў крыніцазнаўчую базу і апісанні каляндарных абрадаў, звычаяў, часткова тэксты песень. У багацці міфалагічнай спадчыны беларусаў, параўнальнай, на думку аўтара, па старажытнасці толькі з сербскай ці балгарскай, пераконваюць “абрадавыя звычаі, што хаваюць у сабе шмат ніцей, якія звязваюць сучаснасць з найаддаленейшым мінулым” [4: 251].

Пашырэнню крыніцазнаўчай базы даследавання славянскіх старажытнасцей спрыяла прыцягненне краязнаўчых ведаў даследчыка і выразілася ў адкрыцці А. Кіркорам шматлікіх тапанімічных паданняў гістарычнага зместу. Даследчык адзначаў, што старажытных паселішчаў чалавека, вечавых сходбішчаў, судзілішчаў, месцаў ахвярапрынашэнняў, месцаў сходаў вакольных жыхароў у выпадку нападзення ворагаў у Беларусі вельмі шмат. Такія гісторыка-археалагічныя звесткі, аздобленыя ўзорамі народных эпічных твораў, паведамлялі К. Тышкевіч, А. Плятэр. Многія варыянты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыведзеныя ў у нарысах “Жывапіснай Расіі”, з’яўляюцца арыгінальнымі варыянтамі: паданне пра Князь-возера і замак князёў Слуцкіх-Алелькавічаў [4: 334], паданне пра царкоўны звон, якое адносіцца да часоў Паўночнай вайны [4: 331], паданні пра Магілёў часоў Паўночнай вайны: захоп горада войскамі Карла XII і Пятра I [4: 407], паданне пра Дуброўну на Аршаншчыне [4: 415], паданне пра гару Рагнеды на Полаччыне [4: 248], паданні пра Крычаў [4: 421], паданні пра Тураў [4: 379], паданне пра Дзмітрыя Янчына, уладальніка Прапойска [4: 424]. Матывы скамянення, ухода пад зямлю / ваду, вядзьмарства, скрадзення нехрышчоных дзяцей, матывы невыканальных заданняў, цудоўных ахоўнікаў прысутнічаюць у названых эпічных творах. Іх семантыка выяўляе  генетычную сувязь з міфам. “Часам немагчыма раздзяліць міф і гістарычнае паданне, – піша Т. Шамякіна. – Легенды, успаміны, хаджэнні, жыціі, хранікальныя запісы належаць да гістарычных апісанняў, але ўзыходзяць да міфапаэтычнай творчасці” [7: 159].

Як міфолаг А. Кіркор не ставіў мэты рэканструяваць міфалогію як тып культуры, заснаваны на архаічных формах ментальнасці, што абумоўлена аб’ектыўным станам народазнаўчай навукі XIX ст., аднак ён істотна пашырыў крыніцазнаўчую базу міфалагічнага даследавання, уключыўшы ў яе апісанні абрадаў, павер’яў, абрадавых рэгламентацый, асобныя празаічныя і песенныя жанры, а таксама дадзеныя археалогіі і краязнаўства. Міфалагізм навукова-публіцыстычных тэкстаў А. Кіркора мае не рэтраспектыўную скіраванасць, ён зарыентаваны на сцвярджэнне ў тагачаснай навуцы і сацыяльнай сферы ідэі унікальнасці і самабытнасці народнай культуры беларусаў.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. **Янчук**, Н. А. А. К. Киркор: Краткий очерк жизни и деятельности / Сост. Н. Янчук. - М.: Тип. А. И. Мамонтова и К, 1888. - 29 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. **Пыпин**, А. Н. История русской этнографии: в 4 т. / А. Н. Пыпин. — СПб.: Тип. М. М. Стасюлевича, 1890—1892. —Т. 4: Белоруссия и Сибирь. — 1892. — 488 с.
3. **Цішчанка**, І. К. Да народных вытокаў : Збіранне і вывучэнне бел. фальклору ў 50-60-я гг. XIX ст. / І.К.Цішчанка. - Мн. : Навука і тэхніка, 1986. - 246 с.
4. **Живописная** Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Мн.: БелЭн, 1993. – 550 с.
5. **Славянские** древности: Этнолингв. словарь : В 5 т. / Под ред. Н.И.Толстого. - М. : Междунар. отношения, 1995. Т. 1: А - Г / Т.А.Агапкина, Л.Н.Виноградова, А.В.Гура и др. - 578 с. Т. 2: Д - К (Крошки) / Т.А.Агапкина, О.В.Белова, М.М.Валенцова и др. - 697 с. Т. 3: К (Круг) - П (Перепелка) / Т.А.Агапкина, О. В. Белова, М.М.Валенцова и др. - 697 с.
6. **Шамякіна**, Т. І. Славянская міфалогія: курс лекцый : для студэнтаў-філолагаў спецыяльнасцей 1-21 05 01 "Беларуская філалогія", 1-21 05 02 "Руская філалогія" / Т.І.Шамякіна. - Мінск : Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, 2005. - 155 с.
7. **Шамякіна**, Т. І. Міфалогія Беларусі: Нарысы : Вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / Т.І.Шамякіна. - Мн. : Выд. рэсп. унітар. прадпрыемства "Маст. літ.", 2000. - 398, [1] с.
8. **Мифы** народов мира: Энциклопедия: В 2 т. / Под ред. С. А. Токарева. - М.: Большая Российская энциклопедия, 1987-1988. Т. 1: А - К. - 671 с.; Т. 2: К - Я. - 719 с.
9. **Смирнов**, М. Ю. Мифологическое сознание и религия : Теоретико-методол. исслед. : Автореф. дис. на соиск. учен. степ. д-ра филос. наук : 09.00.13 / М. Ю. Смирнов. - Спб. гос. ун-т, СПб.: 2002. - 44 с.
10. **Судник** Т. М., Цивьян Т. В. К реконструкции сюжета основного мифа в балто-балканской перспективе (фрагмент "Жена и дети громовержца") //
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Этнолингвистические балто-славянские контакты в настоящем и прошлом : конф., 11-15 дек. 1978 г. : Предвар. материалы / Редкол.: В.В.Иванов и др. - М. : Наука, 1978. - С. 124-131.

**Топорков**, А. Л. Об источниках «поэтических воззрений славян на природу» / А. Л. Топорков. – А. Афанасьев. Поэтические воззрения славян на природу: Справ.-библиогр. материалы / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения. – М.: Индрик, 2000. – С. 7-50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ